УДК 351.853:061.1-053.81(100)

А. Я. Паўлава,
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

# ФОРУМЫ МАЛАДЫХ ЭКСПЕРТАЎ ЯК ПАЗІТЫЎНЫ ВОПЫТ ЗАХАВАННЯ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ СУСВЕТНАЙ СПАДЧЫНЫ

Спадчына стварае ідэнтычнасць. Зыходзячы з гэтай ідэі, асобныя людзі і грамадства нясуць адказнасць за ўстойлівае захаванне спадчыны. Згодна з Канвенцыяй аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны (1972) кожнаму чалавеку прапануецца ўдзельнічаць у працэсах выяўлення, вывучэння, інтэрпрэтацыі, абароны, захавання і папулярызацыі сусветнай спадчыны.

На рубяжы стагоддзяў міжнародная практыка дзеянняў у дачыненні да сусветнай спадчыны змянілася ад простага захавання помнікаў да «кіравання спадчынай», дзе захаванне з'яўляецца адным з кампанентаў [14 p. 185–187]. Сёння прыцягненне розных зацікаўленых бакоў і сацыяльных груп мае вырашальнае значэнне для забеспячэння захавання і папулярызацыі спадчыны. Моладзь з'яўляецца сувязным звяном паміж мінулым, сучаснасцю і будучымі пакаленнямі і ключавым удзельнікам распаўсюджвання каштоўнасцей спадчыны.

Ідэя прыцягнуць моладзь да захавання і папулярызацыі сусветнай спадчыны вынікае з артыкула 27 Канвенцыі аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны [3]. Інстытуцыянальнае афармленне дадзенай ідэі адбылося ў 1994 г. з запускам спецыялізаванай праграмы ЮНЕСКА «Удзел моладзі ў захаванні і папулярызацыі сусветнай спадчыны», распрацаванай з улікам захапленняў маладога пакалення [13]. Культурныя падзеі і мерапрыемствы, заснаваныя на непасрэдным удзеле моладзі, маюць мэтай ператварыць яе са звычайных карыстальнікаў культурнай спадчыны і культурнай прасторы ў добраахвотных і мэтанакіраваных прыхільнікаў.

Даследаванні, прысвечаныя канцэптуалізацыі ўдзелу моладзі ў кантэксце кіравання культурнай спадчынай, дазваляюць пазначыць некаторыя канцэптуальныя высновы. Часам маладыя

людзі слаба ўяўляюць размеркаванасць аб’ектаў сусветнай спадчыны паміж краінамі і кантынентамі. Лепей арыентуюцца і разумеюць праблему студэнты і выпускнікі гістарычных, мастацтвазнаўчых і геаграфічных факультэтаў устаноў адукацыі [7; 12]. Пры распрацоўцы стратэгій уключэння прадстаўнікоў маладога пакалення ў працэс захавання і папулярызацыі сусветнай спадчыны патрэбна мець на ўвазе зменлівы характар гэтай сацыяльнай групы. Дэніз Ікіз Кайя і Іньсінь Чжан у якасці прычыны недастатковага ўдзелу моладзі ў спадчынаахоўнай дзейнасці называюць разгляд перспектыў яе ўдзелу выключна ў фарматах, якія прапануюцца прадстаўнікамі папярэдніх пакаленняў [17]. Даследаванні (2021) албанскіх калег паказваюць, што прадстаўнікі маладога пакалення, наадварот, чакаюць ініцыятывы з боку мясцовых уладаў [7].

Як сведчаць расійскія калегі, інструментары праграмы ЮНЕСКА «Удзел моладзі ў захаванні і папулярызацыі сусветнай спадчыны», а таксама шматлікія рэкамендацыі, якія распрацаваны з улікам захапленняў маладога пакалення, насамрэч не даюць канкрэтных рэкамендацый, але могуць быць адаптаваны пад праект для канкрэтнага аб’екта сусветнай спадчыны [1; 13]. Поспех удзелу моладзі ў захаванні сусветнай спадчыны залежыць ад таго, наколькі канкрэтныя інструменты ажыццяўлення праектаў адпавядаюць запытам моладзі ў галіне набыцця навыкаў, вопыту працы або ўдзелу ў міжнародным праекце.

Адной з форм удзелу моладзі ў папулярызацыі спадчыны з’яўляюцца форумы маладых спецыялістаў, якія за 28 гадоў сталі важным складнікам мерапрыемстваў адукацыйнай праграмы ЮНЕСКА [15]. Ідэя правядзення форуму паўстала ў Цэнтры сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ў 1993 г. З часу першага форуму ў Нарвегіі (1995) было праведзена больш за 40 падобных мерапрыемстваў. Форумы служаць каталізатарам, натхняючым на развіццё мерапрыемстваў па кіраванні сусветнай спадчынай як на мясцовым, так і на міжнародным узроўні. Мерапрыемствы форумаў дапамагаюць стварэнню сінергіі паміж сталымі спецыялістамі па спадчыне і моладдзю. Маладыя людзі атрымліваюць уяўленне аб кіраванні спадчынай на аснове абагульнення вопыту прымаючай краіны, наведвання яе аб’ектаў сусветнай спадчыны, а таксама маюць магчымасць сустрэцца з членамі Камітэта сусветнай спадчыны ЮНЕСКА (КСС) і яго кансультатыўных органаў і дэталёва абмеркаваць

рэалізацыю Канвенцыі 1972 г. у сённяшніх умовах. Выніковыя Дэкларацыі форумаў прадстаўляюцца на сесіях Камітэта сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, якія праводзяцца адначасова з форумамі.

Доказам прызнання ўкладу моладзі ў кіраванне сусветнай спадчынай з'яўляецца той факт, што ў 2015 г. маладзёжны форум павысіў свой статус, атрымаўшы назву «Форум маладых экспертаў». Аўтар прааналізавала тэкставыя матэрыялы, выніковыя Дэкларацыі форумаў і відэарэлізы і прыйшла да высновы аб карыснасці іх вывучэння беларускімі студэнтамі і маладымі спецыялістамі.

Вывучэнне асноватворных дакументаў у сферы кіравання спадчынай з'яўляецца абавязковым пунктам праграмы міжнародных форумаў. Падчас першага форуму ў якасці мэт мерапрыемства пазначаліся прыцягненне ўвагі маладых людзей да важнасці Канвенцыі аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны і ведання аб'ектаў сусветнай спадчыны на тэрыторыі сваёй і іншых краін; садзейнічанне захаванню традыцыйных навыкаў, неабходных для аднаўлення і падтрымання аб'ектаў сусветнай спадчыны; дапамога па фарміраванні канкрэтных магчымасцей для ўмацавання пачуцця адказнасці маладых людзей за культурную і прыродную спадчыну [5].

Удзельнікі форумаў рэгулярна ўносяць у тэкст выніковай Дэкларацыі прапановы аб пашырэнні ведаў аб сусветнай спадчыне, уключэнні абавязковага наведвання яе аб'ектаў у нацыянальныя навучальныя праграмы сярэдняй і вышэйшай адукацыі. У падрыхтоўцы адукацыйных матэрыялаў для школьнікаў і студэнтаў павінны прымаць удзел маладыя эксперты. Рэкамендацыі маладзёжных форумаў экспертаў аб шырокай адукацыйнай дзейнасці застаюцца актуальнымі і зараз, аб чым сведчаць вынікі даследаванняў спецыялістаў на розных кантынентах. Гэтую думку пацвердзілі нядаўнія даследаванні нямецкіх спецыялістаў [7; 10–12; 17].

За 28 гадоў з часу правядзення першага форуму КСС ЮНЕСКА і ІКАМОС экперыментавалі з фарматам сустрэчы. Да 2015 г. сфарміраваўся дзеючы варыянт мерапрыемства. Прыём заявак абвяшчаецца вясной. Жадаючыя прыняць удзел павінны быць спецыялістамі ў галіне сусветнай спадчыны. Зараз удзельнікамі могуць стаць маладыя прафесіяналы, якія маюць не менш за год вопыту работы ў галіне культурнай або

прыроднай спадчыны (спецыялісты ў галіне археалогіі, архітэктуры, аховы, гарадскога планавання, рэстаўрацыі, гісторыі мастацтваў, музейнай дзейнасці, менеджары спадчыны і інш.). Змена статусу мерапрыемства выклікала і павышэнне ўзросту ўдзельнікаў (20–32 гады). Кожны малады эксперт павінен падрыхтаваць невялікую прэзентацыю, прысвечаную аднаму з аб’ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, што знаходзіцца на тэрыторыі яго роднай краіны. У выніковай канферэнцыі, якая доўжыцца 10–12 дзён, прымаюць удзел каля 30 чалавек. Пры адборы ўдзельнікаў арганізатары імкнуцца вытрымаць роўнае гендарнае і геаграфічнае прадстаўніцтва. Мерапрыемства складаецца з пленарнага пасяджэння і панэльных дыскусій, творчых майстар-класаў і экскурсій на аб’екты Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Поспех першага маладзёжнага форуму дазволіў ініцыяваць правядзенне форуму ў Дуброўніку. Студэнты, удзельнікі форуму 1996 г., канстатавалі, што для ўсведамлення маладымі людзьмі свайго ўкладу на нацыянальным і глабальным узроўнях важна працаваць на аб’ектах рэстаўрацыі. Асноўным імператывам Дэкларацыі цэнтральнаеўрапейскага форуму «Сусветная спадчына ў руках моладзі» ў Брацiславе (2002) стала запатрабаванасць адукацыйнага інавацыйнага падыходу да фарміравання ў моладзі пачуцця агульнай культурнай і прыроднай спадчыны. Такі падыход дазволіць моладзі разглядаць аб’екты Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА не як «дэманстрацыйныя ўзоры», а як крыніцу ведаў, прадмет гонару і самарэалізацыі для маладога пакалення [5].

Як адзначаюць Шэрыфе Озата, прадстаўніца Турцыі на форуме маладых экспертаў (2015), і Ая Міядзакі з універсітэта Токіа, форум пад дэвізам «На шляху да ўстойлівага кіравання аб’ектамі сусветнай спадчыны» прадаставіў маладым спецыялістам новыя магчымасці. Разглядаючы ўдзельнікаў форуму як сапраўдных калег і з мэтай разумення механізма працы Камітэта сусветнай спадчыны, арганізатары прапанавалі ўдзельнікам змадэляваць яго пасяджэнне. Удзельнікі пацвердзілі неабходнасць валанцёрства для кіравання гістарычнай спадчынай. Як сведчанне важнасці выкарыстання IT для рэалізацыі Канвенцыі, па заканчэнні форуму 33 удзельнікі стварылі часовую анлайн-платформу для маладых экспертаў па спадчыне, сайт і старонку ў сацыяльных сетках [9; 11].

У 2019 г. цэнтрам правядзення форуму маладых спецыялістаў па сусветнай спадчыне стала адна з дзяржаў СНД – Азербайджан. Тэма форуму – «Сусветная спадчына: мясцовае разуменне глабальных праблем». Форум упершыню паслужыў платформай для вывучэння розных аспектаў захавання і распаўсюджвання нематэрыяльнай спадчыны. У выніковай Дэкларацыі маладыя эксперты, прадстаўляючы свой погляд на глабальныя праблемы гарадской спадчыны і культурных ландшафтаў, звярнулі ўвагу на неабходнасць павышэння ролі мясцовых супольнасцей у гэтай дзейнасці [5].

Тэма суадносін сусветнай спадчыны і турызму некалькі разоў паўставала падчас дыскусій на форумах. Так, другі Ібераамерыканскі форум прайшоў пад дэвізам «Культурны ландшафт і ўстойлівы культурны турызм». Тэмай першага форуму маладых спецыялістаў у Азіі вызначылі «Кіраванне помнікамі, супольнасць і турызм».

Краінай – арганізатарам форуму маладых спецыялістаў па сусветнай спадчыне 2021 г. стала Кітайская Народная Рэспубліка (КНР). Тэма сустрэчы была вызначана як «Сусветная спадчына і ўстойлівыя сродкі да існавання». Упершыню з моманту запуску ініцыятывы форум года быў праведзены ў віртуальным фармаце ў сувязі са складанай эпідэміялагічнай абстаноўкай, выкліканай пандэміяй COVID-19. Анлайн-дыскусіі ўдзельнікаў-практыкаў пацвердзілі меркаванні спецыялістаў пра захаванне актуальнасці пошуку аптымальных варыянтаў турыстычнай актыўнасці на аб’ектах Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА [8]. Падобная размова стала больш актуальнай у час выкліканага пандэміяй COVID-19 крызісу, які негатыўна адбіўся на ўсіх сферах жыцця. У святле паўстаўшых праблем маладыя спецыялісты прызналі неабходнасць радыкальна пераасэнсаваць падыход да шматграннай спадчыны і прыступілі да распрацоўкі рэкамендацый «Сусветная спадчына і ўстойлівыя крыніцы сродкаў да існавання» [5; 16]. За кожным выступленнем экспертаў ішлі майстар-класы, праводзіліся дыскусіі паміж маладымі спецыялістамі, якія пераадольвалі цяжкасці і абмежаванні ўзаемадзеяння ў віртуальным фармаце.

Форум у Эль-Рыядзе (2023) стаў адным з мерапрыемстваў святкавання 50-годдзя Канвенцыі 1972 г. і часткай пашыранай 45-й сесіі Камітэта сусветнай спадчыны. Тэму форуму вызначылі як «Погляд у будучыню: наступныя 50 гадоў аховы

прыроднай і культурнай спадчыны». Мэта форуму бачылася арганізатарам наступным чынам: паглыбіць веды і навыкі маладых спецыялістаў у галіне аховы, кансервацыі і папулярызацыі прыроднай і культурнай спадчыны на бліжэйшыя 5 гадоў і наступны перыяд. Адпаведна, форум стаў пляцоўкай для ацэнкі дасягненняў Канвенцыі за 5 дзесяцігоддзяў і пачаўся з актуалізацыі палажэнняў і стратэгічных мэт. У выніковай дэкларацыі маладыя эксперты падкрэслілі, што за 50 гадоў Канвенцыя забяспечыла ахову і папулярызацыю спадчыны чалавецтва. Конкурс на ўдзел у форуме атрымаўся самы вялікі за 28 гадоў – 17 000 прэтэндэнтаў на 34 месцы.

На пляцоўках форуму (2023) працягнулася абмеркаванне тэмы ўстойлівага турызму. Адзначаючы станоўчы культурна-адукацыйны эфект ад пераўтварэння больш чым 1000 аб’ектаў са Спіса сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ў папулярныя турыстычныя дэстынацыі ў 167 краінах, маладыя эксперты выказалі заклапочанасць магчымымі адмоўнымі наступствамі такіх змен як для аб’ектаў, так і для мясцовай супольнасці. Маладыя эксперты прызналі, што толькі забеспячэнне эфектыўнага кіравання Сусветнай спадчынай ЮНЕСКА дапаможа пазбегнуць негатыўнага ўплыву «звыштурызму» на яе аб’екты. Грунтуючыся на аналізе матэрыялаў маладзёжных форумаў, можна вылучыць тры аспекты прапаноў, зробленых у дачыненні да спадчыны і турызму: узмацненне аховы, пашырэнне распаўсюджвання каштоўнасцей спадчыны і пашырэнне правоў і магчымасцей супольнасцей [16].

Абмяркоўваючы лічбавае вымярэнне Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, маладыя спецыялісты адзначылі вялікую ролю IT у пашырэнні ведаў аб аб’ектах спадчыны, а таксама ўзмацненне аховы спадчыны з дапамогай тэхналогій. У якасці слоганаў для актуальных спосабаў кіравання Сусветнай спадчынай ЮНЕСКА ўдзельнікі форуму прапанавалі некалькі ідэй: «Спадчына – крыніца нашай сілы, а не нашай слабасці» і «Роля моладзі ў сектары спадчыны заключаецца не толькі ў захаванні мінулага, але і ў інавацыях будучыні». Дэкларацыя была прадстаўлена 195 дзяржавам – удзельніцам Канвенцыі. Маладыя спецыялісты засведчылі аб гатоўнасці браць адказнасць за захаванне спадчыны для будучых пакаленняў у свае рукі [5].

Форум маладых спецыялістаў па сусветнай спадчыне (WHYPF) стаў адным з паспяховых праектаў ЮНЕСКА і з’яў-

ляецца не толькі платформай для павышэння дасведчанасці маладых людзей аб ахове сусветнай прыроднай і культурнай спадчыны, садзейнічання культурным абменам і прадастаўлення магчымасцей для навучання, але і глабальнай сцэнай для дэманстрацыі мудрасці моладзі, выказвання сваіх поглядаў і прыняцця на сябе адказнасці. Вопыт правядзення першага форуму 1995 г. быў падтрыманы ў краінах СНД. У Таджыкістане адбыліся некалькі маладзёжных форумаў «Валанцёрства на абшарах СНД», у якіх брала ўдзел і дэлегацыя Рэспублікі Беларусь. У 2022 г. у Кыргызскай Рэспубліцы прадстаўнікі Беларусі прымалі ўдзел у Міжнародным маладзёжным форуме інтэлектуалаў, прысвечаным Году народнай творчасці і культурнай спадчыны СНД [4]. Праграма форуму спалучала ў сабе пленарныя пасяджэнні з экскурсіямі на аб’екты культурнай спадчыны і майстар-класамі па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Значная колькасць сустрэч маладых прафесіяналаў у галіне захавання Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА праводзіцца расійскімі калегамі (Масква, Санкт-Пецярбург, Казань) [6]. Цікавы фармат каманднага ўдзелу ў маладзёжным мерапрыемстве з шырокім прадстаўніцтвам у 2022 г. прапанавалі арганізатары V юбілейнага форуму «Спадчына», у якім прынялі ўдзел каманды 29 УВА [2].

Падводзячы вынікі, можна канстатаваць, што вопыт і матэрыялы міжнародных форумаў маладых экспертаў у галіне захавання і папулярызацыі аб’ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА з’яўляюцца актуальнымі і для маладых спецыялістаў музейна-турыстычнай галіны ў Рэспубліцы Беларусь. А выпускнікі кафедры гісторыка-культурнай спадчыны па заканчэнні навучання валодаюць усімі неабходнымі тэарэтычнымі і практычнымі ведамі для падачы заявак на ўдзел у падобных міжнародных форумах маладых прафесіяналаў.

---

1. *Айтуганова, Н. Л.* Вовлечение молодежи в сохранение Всемирного наследия ЮНЕСКО: адаптация международных рекомендаций на примере объекта «Болгарский историко-археологический комплекс» [Электронный ресурс] / Н. Л. Айтуганова, Л. М. Бузина. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/vovlechenie-molodezhi-v-sohranenie-vsemirnogo-naslediya-yunesko-adaptatsiya-mezhdunarodnyh-rekomendatsii-na-primere-obekta-bolgarskii. – Дата доступа: 02.12.2023.

*2.* Важно вместе со студентами идти в будущее, сохраняя наследие [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.hse.ru/news/life/791085932.html. – Дата доступа: 01.12.2023.

*3.* Конвенция об охране всемирного культурного и природного наследия [Электронный ресурс] // unesco.org : официальный сайт. – Режим доступа: https://whc.unesco.org/en/convention/. – Дата доступа: 28.11.2023.

*4.* Об итогах реализации мероприятий, посвященных Году народного творчества и культурного наследия в Содружестве Независимых Государств [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cis.minsk.by/news/25215/ob_itogah_realizacii_meroprijatij_posvjaschennyh_godu_narodnogo_tvorchestva_i_kulturnogo_nasledija_v_sodruzhestve_nezavisimyh_gosudarstv/. – Дата доступа: 02.12.2023.

*5.* Сусветны моладзевы форум сусветнай спадчыны [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://whc.unesco.org/en/youth-forum/. – Дата доступу: 27.11.2023.

*6.* «Этот форум нас объединяет» – иностранные делегаты о международном форуме к 50-летию Конвенции ЮНЕСКО в Казани [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://unesco.ru/en/news/foreign-delegates-about-the-international-forum/. – Дата доступа: 02.12.2023.

*7.* Assessing Youth Engagement in the Preservation and Promotion of Culture Heritage: A Case Study in Korça City, Albania [Electronic resource] / E. Menkshi [et al.] // Quaestiones Geographicae. – 2021. – № 40 (1). – P. 109–125. – Mode of access: https://doi.org/10.2478/ QUAGEO-2021-0009. – Date of access: 27.11.2023.

*8.* 50 years World Heritage Convention: shared responsibility – conflict and reconciliation. – Conference Vol. – Springer, Cham, Switzerland. – 504 p.

*9. Miyazaki, A.* International Focus on Young Professionals in Culture Heritage Conservation. CR [Electronic resource] / A. Miyazaki // Conservación Y Restauración. – 2019. – № 17. – P. 181–185. – Mode of access: https://revistas.inah.gob.mx/index.php/cr/article/view/15092. – Date of access: 30.11.2023.

*10. Röll, V.* Young People’s Perceptions of World Cultural Heritage: Suggestions for a Critical and Reflexive World Heritage Education [Electronic resource] / V. Röll, C. Meyer // Sustainability. – 2020. – 12 (20). – Mode of access: https://doi.org/10.3390/su12208640. – Date of access: 30.11.2023.

*11. Şerife, Özata.* World Heritage protection would not be complete without youth [Electronic resource] / Özata Şerife. – Mode of access: https://www.researchgate.net/publication/324280796_Serife_Ozata_World_Heritage_protection_would_not_be_complete_without_youth. – Date of access: 02.12.2023.

*12. Spiridon, Petronela.* Creactive youth promoting cultural heritage for tomorrow [Electronic resource] / Petronela Spiridon, Marianna Kosic, Blerta Tuci. – Mode of access: https://www.researchgate.net/publication/

305490149_CRE-ACTIVE_YOUTH_PROMOTING_CULTURAL_HERITAGE_FOR_TOMORROW. – Date of access: 01.12.2023.

*13.* UNESCO Young People's World Heritage Education Programme [Electronic resource]. – Mode of access: https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000183311. – Date of access: 02.12.2023.

*14. Wijesuriya, G.* From 'sustaining heritage' to 'heritage sustaining broader societal wellbeing and benefits': An ICCROM perspective. World Heritage and Sustainable Development: New Directions in World Heritage Management [Electronic resource] / G. Wijesuriya. – Mode of access: https://www.academia.edu/102945765/From_sustaining_heritage_to_heritage_sustaining_broader_societal_wellbeing_and_benefits_An_ICCROM_perspective. – Date of access: 02.12.2023.

*15.* World Heritage Education Programme [Electronic resource] // UNESCO World Heritage Centre. – Mode of access: https://whc.unesco.org/en/wheducation/. – Date of access: 01.12.2023.

*16. Yang Xiaopeng.* Young People's Views on Heritage and Tourism : Review of previous World Heritage Young Professionals Forum [Electronic resource] / Yang Xiaopeng. – Mode of access: https://www.44whcfuzhou2021.cn/node/13495/20210609/60c08767cb7f8.shtml. – Date of access: 02.12.2023.

*17.* Youth participation in cultural heritage management: a conceptual framework [Electronic resource] / Yingxin Zhang [et al.] // International Journal of Heritage Studies. – 2023. – Mode of access: DOI: 10.1080/13527258.2023.2275261. – Date of access: 02.12.2023.

УДК 338.483.1-053.81(476):316.7

С. А. Пациенко,
*кандидат культурологии,*
*доцент кафедры менеджмента социально-культурной деятельности учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», Минск, Беларусь*

## ОРГАНИЗАЦИЯ МОЛОДЕЖНОГО ТУРИЗМА КАК СРЕДСТВО ПОПУЛЯРИЗАЦИИ ВСЕМИРНОГО НАСЛЕДИЯ

Молодежный туризм представляет собой широко распространенное социально-культурное явление, которое подразумевает путешествия молодых людей в возрасте от 15 до 24 лет (согласно определению Организации Объединенных Наций) за пределами их привычной жизненной среды с познавательными, рекреационными, образовательными и другими целями [4, с. 77–78]. Развитие молодежного туризма в Республике